СЕНЬНЯ НА ВУЛІЦАХ ПАРЫЖУ, БЭРЛІНУ, ЛЕНДАНУ НЬЮ-ЕРКУ...
ПРОЛЕТАРЫЯТ „ПРЫЗЫВАЕ“ ІМПЭРЫЯЛІСТЫХ „К ПАРАДКУ“

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Кошт асобнага №—2 кап.

№ 176 (1445) | СУБОТА, 1 жніўня 1931 г.

УМЕЦЬ МЫ БУДЗЕМ МЕЦІЦЦА І ПРАВІЛЬНА СТРАЛЯЦЬ!

Працоўныя Савецкага Саюзу і асабліва комсамол, натуральны рэзэрв Чырвонай арміі, павінны аўладаць сакрэтамі ваенных ведаў, павінны вывучаць тэхніку вайны, каб у любую хвіліну змаглі стаць на абарону краіны будучага соцыялізму.

Дзень першага жніўня—дзень мобілізацыі працоўных сіл супроць пагрозы вайны.

У міжнародны рэволюцыйны дзень мы павінны яшчэ больш узмацніць работу па ваенізацыі, больш сыстэматычна і паглыблена вывучаць вайсковыя веды.

Узоры работы колектыву рабочых заводу імя Варашылава і Бабруйскай комсамоліі павінны быць пераняты ўсёй комсамоліяй БССР.

Бальшавіцкай работай па выкананьню гаспадарчых задач, работай па аўладаньню тэхнікай вайсковых ведаў будзем узмацняць абароназдольнасьць нашай краіны.



Група асоавіяхімаўцаў на занятках.

Прыклад бальшавіцкай работы

Бабруйская комсамольская організацыя ў справе ваенізацыі мае вялікія дасягненьні.

Яны дасягнуты галоўным чынам таму, што за гэтую справу дружна ўзяліся і комсамол і Асоавіяхім, а таксама таму, што замест гурткоў вайсковых ведаў адразу былі організаваны вучпункты.

Райсавет АСОавіяхіму і РК ЛКСМБ організавалі на гораду 11 вучпунктаў. Кожны з іх мае вайскова-тэхнічны ўхіл. Начальнікамі пунктаў зьяўляюцца камандзіры кадравых часьцей РСЧА. Гэтым самым дасягаецца тое, што сувязь паміж Чырвонай арміяй і комсамолам узмацняецца яшчэ больш і тое, што гэтыя вучпункты атрымоўваюць магчымасьць карыстацца матар'яльнай часткай і вайсковымі прыладамі вайсковых часьцей.

Комсамольцы па вучпунктах разьбіты такім чынам, што іх вайсковая вучоба адпавядае іх рабоце на вытворчасьці. Так, напрыклад, комсамольцы комбінату будаўнікі абучаюцца сапёрнай справе, мэталісты—кулямётнай.

У Бабруйску райсаветам АСО організован Дом абароны з добра абарудаванымі габінэтамі. У гэтых габінэтах праводзіцца тэорытычная вучоба комсамольцаў.

Вучэбна-практычны плян работы вучпунктаў даведзен да кожнага комсамольца, кожны з іх спаборнічае на лепшае выкананьне пляну. Разгорнута соцспаборніцтва паміж вучпунктамі. Такой пастаноўкай работы дасягнута 100 проц. наведваньне і добрая ўсваемасьць комсамольцамі вайсковых ведаў. Комсамольцы на вучпунктах ужо прайшлі програму першай і другой ступені.

Акрамя гэтых вучпунктаў організаваны рад курсаў па падрыхтоўцы комсамольцаў у вайсковыя школы. Організаваны авіа-маторныя курсы, курсы сувязі, кавалерыйская школа малодшага камандзячага складу.

Гэта школа мае асаблівыя дасягненьні. Для праверкі і ўзмацненьня сваіх ведаў. Для правядзеньня масавай работы па растлумачаньню гаспадарча-палітычных задач. Курсантамі гэтай школы колькасьцю 13 чалавек быў праведзен конны агітпрабег Бабруйск-Менск, прысьвечаны 11-годзьдзю вызваленьня Беларусі ад белапалякаў. За гэты час яны пакрылі адлегласьць у 228 кілёмэтраў. Удзельнікамі прабегу ў дарозе праароблена вялізарная работа. Організаваны чатыры колгасы. Распаўсюджаны аблігацыі пазыкі „трэцяга рашаючага“ і сабрана ў фонд абароны краіны каля 8 з пал. тысяч рублёў, організавана 12 ячэек АСО, 9 ударных брыгад па збору ўраджаю, організаваны некалькі суботнікаў па збору каменьняў і яшчэ шмат чаго прарабілі ўдзельнікі прабегу за гэты час. У Менск яны прыбылі роўна ў вызначаны час—11 ліпеня. Будучы ў Менску яны наведалі рад прадпрыемстваў, на якіх азнаёміліся з работай АСОавіяхіму, сумесна з мясцовымі організацыямі ўдарныя АСОавіяхімаўскія цэхі, брыгады і г. д.

За добра праведзены конны агітпрабег усе ўдзельнікі прабегу ўзнагароджаны ЦС АСО гасьцюмамі. Уся школа ўзнагароджана Чырвоным Сьцягам, інструктар школы Міранцоў—Сьцягам АСОавіяхіму, Бараноўскі адказны сакратар і начальнік школы ўзнагароджан падзякай.

И.

Узоры ўдарнай працы

На машынна-будаўнічым заводзе імя Варашылава (Менск) у галіне ваенізацыі і шэфства над паветраным і морскім флётамі праведзена вялікая работа. Адозва IX зьезду УсеЛКСМ шырока распрацована на сходзе колектыву, цэхавых сходах з шырокім прыцягненьнем беспартыйнай рабочай моладзі. Комсамольскі колектыў заводу практычна ажыцьцяўляе шэфства над АБВШ.

Комсамольская організацыя заводу сабрала 300 руб. на абсталяваньне ленінскага кутка падшэфнікаў. Усяго сабрана для падшэфнай часьці звыш 700 руб.

Зараз вайсковай вучобай на заводзе ахоплена 140 чалавек комсамольцаў і рабочай моладзі. З іх 20 чалавек навучаецца па авіяцыі, 30 чалавек па танковай справе і 90 чал. па іншых галінах вайсковай тэхнікі.

З адмоўных бакоў комсамольскага колектыву ў галіне ваенізацыі трэба адзначыць наступныя: комсамольскі колектыў да гэтага часу не сабраў сродкаў на пабудову самалёту імя ЛКСМБ, ня выпісаны газэты для падшэфных частак, не налажана бібліотэка па пытаньнях вайсковай тэхнікі. Комсамольцы і беспартыйная моладзь недастаткова выпісваюць вайсковыя газэты, як „Красный Черноморец“ і інш. Да гэтага часу ня выканана разьвёрстка гаркому комсамолу аб зборы сродкаў, 100 рублёў на падводную лодку „Комсамолец Беларусі“ і 400 р. на зьвяно самалётаў.

Брыгада „ЧЗ“ Кузьменко і Дзяменцэў.

Вайна—вайне!

Яшчэ ня змыты ў памяці жудасныя малюнкі рабаўнічай вайны 1914 году. Яшчэ не зараўняліся магілы, курганы, дзе пахаваны мільёны ахвяр імпэрыялістычнай „мясарубкі“. Яшчэ жывуць тысячы пакалечаных—жывых сьведак гэтай жудаснай бойні. Яшчэ не залечаны раны, якія прынесла вайна працоўнаму чалавецтву сьвету, як у паветры з кожным днём зноў узмацняецца пах пораху, навісае здань новай рабаўнічай вайны.

У ліхаманцы нябачанага яшчэ дагэтуль у гісторыі эканомічнага крызісу, разьдзіраючыся вострымі супярэчнасьцямі, капіталістыя з сваімі прыхвасьнямі ўсё больш пачынаюць шукаць выхаду ў падрыхтоўцы вайны.

Гэтаму служаць і ўсе прыхвосьні буржуазіі пачынаючы ад рэлігійных служак, соцыял-дэмократаў і канчаючы выгнанымі ў часе рэволюцыі з Савецкага Саюзу белымі генэраламі белагвардзейцамі і іншай зграяй, гэтаму служаць і клясава варожыя элементы ўнутры савецкай краіны.

Вайна буржуазіі патрэбна для таго, каб вырашыць абвостраныя да крайнасьці імпэрыялістычныя супярэчнасьці, але больш за ўсё яна патрэбна для ўціску растучага рэволюцыйнага руху, для паходу супроць ударнай брыгады сусьветнага пролетарыяту—СССР.

У імя падрыхтоўкі вайны фашысцкія каты ў Польшчы. Заходняй Беларусі, у Заходняй Украіне гноюць у засьценках турам тысячы політзьняволеных, фашызмам організуюцца крывавыя карныя экспэдыцыі на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, утвараюцца жудасныя растрэлы рэволюцыйных рабочых і сялян.

У імя падрыхтоўкі вайны соцыял-дэмократычныя поліцэй-прэзыдэнты і поліцыя у Нямеччыне узброенай рукой ахоўваюць дыктатуру Брунінга, сьціскаюць кайданамі рабочыя і працоўныя масы.

У імя падрыхтоўкі вайны „цывілізаваныя“ амэрыканскія каты распраўляюцца на электрычных крэслах з рэволюцыянэрамі, сеюць нацыянальную варожасьць.

У імя падрыхтоўкі вайны з кожным днём узмацняецца цкаваньне Савецкага Саюзу. Буржуазная, фашысцкая, соцыял-фашысцкая і ўсякая бульварная прэса вылівае бязьлікую колькасьць хлусьні па адрасу СССР.

Нарэшце, у імя падрыхтоўкі вайны манэўруюць і ліцамерацць верныя лёкаі буржуазіі папы соцыял-дэмократы. А колькі антысавецкіх провокацый, запісаных за апошнія гады ў гісторыі.

Але ж рабаўнікі ў сваіх плянах натыкаюцца на ўсё больш сур'ёзныя рагаткі. Унутраныя супярэчнасьці ў лагеры імпэрыялізму, выкрыцьцё антысавецкіх плянаў на процэсах „промпартыі“ і меншавікоў у Маскве, абвастрэньне клясавай барацьбы, рост рэволюцыйнага руху ўнутры капіталістычных краін рост рэволюцыянізуючай ролі СССР памеры посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва— усё гэта складае перашкоды ў выкананьні інтэрвэнцыяніцкіх плянаў імпэрыялістых але-ж гэта ні ў якім разе не зьнімае пагрозы вайны.

Лёзунг абароны СССР становіцца ўсё больш популярным сярод шырокіх рабочых і працоўных мас капіталістычных краін.

„Рабочыя і сяляне ўсяго сьвету хочуць захаваць рэспубліку Саветаў як стралу, пушчаную вернай рукой таварыша Леніна ў стан ворагаў, як апору сваіх надзей на вызваленьне ад гнёту і эксплёатацыі, як верны маяк, які паказвае ім шлях аслабаненьня. Яны хочуць яе захаваць і яны не дадуць яе разбурыць абшарнікам і капіталістым. У гэтым наша сіла. У гэтым сіла працоўных усіх краін. У гэтым-жа слабасьць буржуазіі ўсяго сьвету“ (Сталін).

Дык будзем-жа яшчэ больш умацоўваць краіну Саветаў бальшавіцкім выкананьнем плянаў соцыялістычнага будаўніцтва, узмацненьнем яе абароназдольнасьці і баяздольнасьці Чырвонай арміі. Комсамол у гэтым павінен і надалей ісьці пад кіраўніцтвам партыі Леніна ў баявых колёнах змагароў.

Мільёны працоўных замежных краін сёньня, у дзень 1-га жніўня выйдуць магутнымі дэмонстрацыямі на вуліцы для таго, каб дэмонстраваць свае сілы, супроць падрыхтоўкі вайны, у абарону СССР, за сваё соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне. Працоўныя капіталістычных краін сёньня выйдуць пад лёзунгамператварэньня імпэрыялістычнай вайны ў грамадзянскую, пад лёзунгам змаганьня за перамогу пролетарскай рэволюцыі ва ўсім сьвеце.

Вайна—вайне!—вось лёзунг напісаны на штандарах сёньнешніх дэмонстрацый.

МОПР ДА МІЖНАРОДНАГА ЧЫРВОНАГА ДНЯ

Імпэрыялістыя шукаюць выхаду з разьдзіраючага ўвесь капіталістычны сьвет эконамічнага крызісу ва ўзмоцненым наступу на рабочую клясу і ў падрыхтоўцы новых войн, галоўным чынам, супроць СССР.

Падрыхтоўка вайны супроць СССР —гэта важнейшая частка ваенных плянаў, накіраваных супроць рэволюцыйнага пролетарыяту сьвету.

Але мільённыя працоўныя масы яшчэ добра памятаюць жудасныя дні, руйнаваньне імпэрыялістычнай вайны. Працоўныя масы добра памятаюць крывавы баланс імпэрыялістычнай бойкі (10.000.000 забітых, 19 мільёнаў пакалечаных, мільёны ўдоў і сірот). таму ўзмацняючы сваю клясавую салідарнасьць масы ўсяго сьвету вядуць вялізарную барацьбу з падрыхтоўкай новай вайны.

МОПР, як школа інтэрнацыянальнага выхаваньня працоўных мас, больш чым калі, павінен разгарнуць шырокую растлумачальную кампанію сярод мопраўскай 360 тысячнай масы БССР аб баявых задачах у справе ўзмацненьня пролетарскай салідарнасьці, абароны і барацьбы за ўзмацненьне баявой моцы Савецкага Саюзу, у справе ўзмацненьня матар'яльнай і маральнай дапамогі тым 180 тысячам палонькікам капіталу, якія змагаюцца, адбываючы ў турмах свае пакараньні, за вызваленьне рабочае клясы ад эксплёатацыі, прыгнечаньня капіталістымі.

Мопраўцы БССР разам з шматмільённай арміяй мопраўцаў усяго сьвету даказваюць сваю гатоўнасьць абароны СССР ад нападу імпэрыялістых, сваю гатоўнасьць узмацняць фронт міжнароднай пролетарскай солідарнасьці шляхам форсаваньня тэмпаў барацьбы за выкананьне і перавыкананьне трэцяга рашаючага году пяцігодкі, мобілізацыяй сябе на пасьпяховае правядзеньне ўборкі ўраджаю другой бальшавіцкай вясны, на 100 проц. рэалізацыю сярод працоўных мас гораду і вёскі пазыкі „Трэці рашаючы год пяцігодкі“, шляхам разгортваньня падрыхтоўчай кампаніі па збору сродкаў на пабудову інтэрнацыянальных дзіцячых дамоў, для дзяцей політзьняволеных і дапамогай політзьняволеным на зімовы час.

Мопраўцы БССР за апошні год ня раз дэмонстравалі і протэставалі супроць безчалавечных катаваньняў карных экспэдыцый фашысцкага тэрору, супроць прасьледваньняў рэволюцыйных рабочых і сялян у Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне. Дастаткова ўспомніць аб зьверствах у Луцку, карных экспэдыцыях у Заходняй Беларусі аб провокацыях фашыстых і соцыял-фашыстых у Падбродзьдзі, аб зьдзеках фашысцкага ўраду Польшчы над працоўнымі Заходняй Беларусі ў часе паводкі. Ва ўсіх гэтых кампаніях протэсту мопраўцы БССР выявілі сваю солідарнасьць з працоўнымі масамі З. Беларусі ў іх барацьбе за вызваленьне з-пад уціску ўраду фашыстых і абшарнікаў.

1-га жніўня будзе зьяўляцца для ўсіх мопраўскіх організацый БССР пачаткам разгорнутай работы па кампаніі зімовае дапамогі політзьняволеным і пабудовы інтэрнацыянальных дзіцячых дамоў.

3-ці пленум ЦК МОПР'у БССР, які гэтымі днямі скончыў сваю работу, ухваліў пастанову прэзыдыуму ЦК аб вызначэньні кантрольнай лічбы па збору сродкаў у гэту кампанію—300 тысяч рублёў і высунуў сустрэчную лічбу 343 тысячы рублёў, будучы ўпэўненым, што беларуская організацыя МОПР'у выканае ўзятыя на сябе абавязкі

Цудзін.

НОВЫ ХЛЕБ ЗАСТАЎ ЗАГАТОЎЦАЎ ЗЬНЯНАЦКУ

Нізоўкі яшчэ ня маюць плянаў цэнтру. Ліквідаваць самацёк. Устанавіць сквазны рабочы кантроль над конвэерам організацыі і правядзеньні хлебазагатовак

Рыхтаваць баявую сустрэчу хлебазагатоўкам

Падрыхтоўка да хлебазагатовак у Лёзьненскім р-не нарастае слабымі тэмпамі. Пытаньне аб гэтым не стала яшчэ прадметам абгаварэньня партыйна-комсамольскай організацыі. Не выпрацаваны конкрэтныя мерапрыемствы па правядзеньню гэтай кампаніі.

Райспажыўсаюз, Райкоопсаюз і Сельпо ня рыхтуюць склады і тары для хлеба. Не ўкомплектаваны апарат для хлебазагатовак.

Трэба форсаваць падрыхтоўку для пасьпяховага правядзеньня хлебазагатовак.

М. Гузоўскі.

У паўднёвых раёнах БССР пачаліся хлебазагатоўкі. Выяўляюцца ганебныя факты непаваротлівасьці, непадрыхтаванасьці загатоўчых організацый да прыёмкі новага хлеба.

Яшчэ поўнасьцю не падрыхтаваны на мейсцах склады, тара. Наркомснаб не даслаў нізоўкам пляны загатовак. Галаваціпы (Чэрвеньскі р-н), гэрої" самацёку на першых кроках выяўляюць сваю нязцольнасьць па-бальшавіцку змагацца за хлеб.

Комсамол не павінен стаяць у баку. Зараз-жа організаваць на ўсіх пунктах, станцыях у саўгасах і колгасах пасты рабочага кантролю над канвэерам організацыі і правядзеньні хлебазагатовак.

Юнкораўскія брыгады, юнкоры павінны ўключыцца на гэты фронт.

Ні фунта хлеба прыватніку! Усе лішкі, чырвонымі абозамі на ссыпныя пункты!

Хлеб пашоў, а загатоўцы не падрыхтаваны

Церахоўка 31. 26-га ліпеня на станцыю Церахоўку прыбылі чырвоныя абозы з колгасу „Церахаўкі“ і з двох колгасаў Грабаўскага сельсавету.

Абозы прымушаны былі прастаяць тры гадзіны лішніх, пакуль загатоўчыя організацыі прынялі грузы. Толькі пасьля таго, як колгасьнікі зьвярнуліся ў РайКК РСІ, былі прыняты грузы.

Загатоўчыя організацыі не падрыхтаваліся, як сьлед да загатовак і займаліся „очкаўцірацельствам“, заяўляючы што ўсё гатова.

„Яшчэ пасьпеем“

Адміністрацыя станцыі Чырвоны Бераг Зах. чыгункі ня рыхтуецца да хлебазагатовак. Склад і загатоўчыя пункты станцыі патрабуюць рамонту, а начальнік станцыі заяўляе: „яшчэ пасьпеем адрамантавацца ў верасьні, цяпер няма часу“.

Рашэньні ЦК УсеКП(б) аб хлебазагатоўках яшчэ не распрацаваны. Такая опортуністычная стаўка на самацёк павінна быць біта.

Рыг. М.

„У нас няма дырэктыў“

У Гатовінскім сельсавеце (Заслаўскі р-н) пра хлебазагатоўкі нічога ня чутно. Падрыхтоўкі ніякай да гэтай кампаніі не праводзіцца. Адсутнічае тара і склады.

Калі ў старшыні сельсавету тав. Крываносава запыталіся аб становішчы падрыхтоўкі, апошні адказаў: „У нас яшчэ няма дырэктыў аб гэтым і таму нічога не рабілі“.

Раённым організацыям, якія яшчэ не раскачаліся неабходна зараз-жа пачаць організоўваць хлебазагатоўкі.

Прыбытак.

Наркамснаб затрымлівае дасылку плянаў

Гомель. 29. (Белта). У раёне ўборка азіміны— у самым разгары, а месцамі пачаўся абмалот. Аднак і дагэтуль Наркамснаб ня выслаў заданьня па збожжазагатоўках што перашкаджае разгортваньню работы. Масцовыя організацыі прыступілі да складаньня свайго пляну загатовак, які рассылаецца ў сельсаветы. Гарком і гарсавет навіравалі ў сельсаветы ўпаўнаважаных па правядзеньню ўборкі і загатовак.



Тэмпы саўгасу „Даное“
На ільняныя палі

Колгасцэнтр павінен па-бальшавіцку кіраваць падрыхтоўкай і правядзеньнем уборкі лёну і канаплі

Саўгас „Даное“ прыступіў да абмалоту

Ударнік Мяжэвіч за 6 дзён скасіў 6 га сенажаці

Гомель, 31-VII. Саўгас „Даное“ 25-ліпеня скончыў уборку азімых. Саўгас прыступае да абмалоту і абавязаўся скончыць яго да 1-га жніўня. Работы па абмалоце вядуцца начной зьменай.

Ударніцтва ў колгасах дае ўсё новых ўзоры соцыялістычных адносін да працы. Усе брыгады касароў колгасу „Чырвоны Бераг“ за выключэньнем адной перавыконваюць норму—скошваюць у дзень у сярэднім па 0,85 га на чалавека. Колгасьнік тав. Мяжэвіч, абвясьціўшы сябе ўдарнікам, абавязаўся скошваць 1 га у дзень. За 6 дзён выканаў абавязацельства і скасіў 6 га. Мяжэвіч прэміяваны.

Узоры самацёку і без'адказнасьці

Белколгасцэнтр да ўборкі тэхкультур зусім непадрыхтаваны і да гэтага часу не ўзяў бальшавіцкіх тэмпаў у гэтай рабоце.

Безадказнейшыя адносіны з боку Белколгасцэнтру наглядаюцца ў рассылцы рабочых праграм па ўборцы тэхкультур у раёны.

Белколгасцэнтр доўгі час марынаваў іх у сваіх габінэтах і толькі 26-га ліпеня дагадаўся разаслаць іх не ў поўнай колькасьці.

Кіраўнік сэктару тэхкультур т. Шкур дзе, атрымаўшы зьвесткі больш, чым ад 20 раёнаў, палажыў іх у свае шуфляды і да гэтага часу не рэагаваў. На запытаньне брыгады „Чырвонай Зьмены“, як разгортваецца падрыхтоўка да ўборкі тэхкультур у раёнах, кіраўнік адказвае: „Матар'ял ад 20 раёнаў мы атрымалі, але яшчэ не разглядзелі. Аб становішчы працы па падрыхтоўцы да ўборкі ня ведаем“.

Ня лепш з падрыхтоўкай кадраў для ўборкі. З 20-га ліпеня павінны былі распачаць работу двухтыднёвыя курсы на 540 чалавек па падрыхтоўцы брыгадзіраў—мачыльшчыкаў. Колгасцэнтр да гэтага часу ня ведае, як укомплектаваны гэтыя курсы і ці распачалі яны работу.

Канончык і Кузьменка.

На парозе ўборкі тэхнічных культур

(Канец. Пачатак гл. ва ўчарашнім № „ЧЗ“)

У колгасах, дзе не складзены пляны ўборкі і апрацоўкі лёну і канапель, павінны быць зараз-жа складзены і абгавораны на агульных сходах колгасьнікаў. У пляне павінна быць прадугледжана, што павінен рабіць кожны ўдзельнік ільнаўборачнай брыгады і нормы выпрацоўкі.

Пры гэтым павінна быць даведзена да кожнага колгасьніка пастанова Наркомзему і колгасцэнтру аб парадку размеркаваньня прыбыткаў па колгасах і якасьці працы, даючы рашучы адпор кулацкай „ураўнілаўцы“ пры надліку працы і размеркаваньні даходу і выдачы авансаў.

Дзеля сваечасовага правядзеньня ўборкі ў вызначаныя тэрміны патрэбна мобілізаваць і скарыстаць усю наяўнасьць рабочай сілы.

Асабліва дрэнна ў нас абстаіць справа з уцягненьнем працы жанчын у той час, як ва ўборцы і апрацоўцы тэхнічных культур жаночая праца адыгрывае вельмі значную ролю. Таму неабходна рашуча ўзяцца за вызваленьне жанчыны ад хатніх работ шляхам організацыі дзіцячых ясьляў, пляцовак і грамадзкага харчаваньня.

Побач з гэтым неабходна адзначыць, што ў некаторых мясцох „перагібаюць палку“ ў другі бок, прадстаўляючы ўборку і апрацоўку тэхнічных культур амаль выключна жанчынам. Патрэбна ўжо пакончыць з былымі „традыцыямі“ аб тым, што лён—гэта „баб'я справа“. На ўборку лёну павінны быць мобілізаваны нараўне, як мужчыны, так і жанчыны. Апрача таго на ільнаўборку павінна быць шырока ўцягнута праца падлеткаў.

Пры правядзеньні ўборачнай кампаніі неабходна максымальна разгарнуць соцыялістычныя метады працы — ўдарніцтва, соцспаборніцтва, грамадзкі буксір адстаючых і г. г. Патрэбна адзначыць брыгады лепшай узорнай працы, пераносіць гэтыя прыклады на іншыя колгасы і саўгасы, організаваць прэміяваньне лепшых ударнікаў ільнаўборкі.

Паміж пасобнымі колгасамі і брыгадамі павінны быць заключаны дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва на лепшае і хутчэйшае правядзеньне ўборкі, на перавыконаньне норм выпрацоўкі.

Колгасам і саўгасам, у якіх не хапае рабочай сілы з боку колгасаў маючых лішкі рабочай сілы, павінна быць аказана дапамога, для чаго ва ўсіх колгасах патрэбна правесьці падлік працаздольных колгасьнікаў і размеркаваньне іх для поўнага ўцягненьня ў ільнаўборачную работу.

***

У радзе раёнаў справе організацыі уборкі ільну ўдзяляецца недастатковая ўвага і гэтым самым уборка прадастаўляецца самацёку, што стварае небясьпеку зрыву вызначаных тэрмінаў.

Да пачатку разгортваньня масавай уборкі ільну засталіся лічаныя дні. Іх патрэбна скарыстаць для правільнай растаноўкі сіл на адказным фронце—ільнаўборачнай кампаніі. Посьпехі, якія дасягнуты партыяй у часе другой бальшавіцкай вясны, павінны быць і будуць замацаваны пасьпяховай падрыхтоўкай і правядзеньнем уборкі і апрацоўкі ільну і канапель.

М. Гузоўскі.

З перадавых позыцый

Спыніце стралянІну „шрапнэляй“

Перабудаваць работу торпкоопа на Асінторпе. Райкомы ЛКСМБ маўчаць аб мобілізацыі двух тысяч

Выязная брыгада „Чырвонай Зьмены“ і „Комсамольской Правды“ на Асінторпе

„Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы хоча жыць з задавальненьнем усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэбнасьцяй, і ў сэнсе забясьпечаньня харчамі, і ў сэнсе кватэр, і ў сэнсе забясьпечаньня культурных і ўсякіх іншых патрэбнасьцяй. Ён мае на гэта права і мы абавязаны забясьпечыць яму гэтыя ўмовы“ (СТАЛІН)

Пастанова ЦК УсеКП(б), СНК і Цэнтрасаюзу аб перабудове работы коопэрацыі не дайшла да работнікаў торпрабкоопу Асінторпу.

Рэйд ударных брыгад „Чырвонай Зямены“, „Комсомольской Правды“ і „Ленінскага прызыву“ з усёй яскравасьцю ўстанавіў, што пастанова ня толькі не прапрацавана сярод рабочых тарпянікаў, але аб ёй нават ня ведаюць і працаўнікі прылаўку. Загадчык сталоўкі № 1 тав. Сіратокін заявіў, што ён нават ня ведае аб гэтай пастанове.

Пры такім становішчы работа тарпкоопу бязумоўна, перабудавана

Коопэратар Сіратокін — ня ведае аб адозьве ЦК УсеКП(б) СНК і Цэнтрасаюзу



Торпкоопаўская гародніна

фармальна. Рабочы кантроль над работай крамы і сталовак адсутнічае.

Адміністрацыя і торпком Асінторпу ня цікавяцца і не дапамагаюць у рабоце торпкоопу, на агульных сходах работы ніводнага разу не ставілася пытаньня аб рабоце коопэрацыі. Коопбюро нідзе ня створана, кніг для скарг днём з агнём ня знойдзеш.

Маючыяся на складзе продукты, за выключэньнем круп, даюць магчымасьць забясьпечыць добрую страву. Але з-за нядбайнасьці і непадрыхтаванасьці кухарскага пэрсаналу і загадчыкаў сталовак, грамадзкае харчаваньне знаходзіцца ў нездавальняючым становішчы.


Белкоопсаюз упарта ня выконвае пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб палепшаньні асортымэнту продуктаў на Асінторпе. Ужо больш двух тыдняў працягваецца паласа пярловай кашы і рабочыя зусім правільна заяўляюць, што „шрапнэльная“ каша ніяк у горла ня лезе. На шэраг тэлеграм, якія дасланы Белкоопсаюзу, адказу няма.

Загадчык сталоўкі № 1 тав. Сіратокін гаворыць, што яму „няма“ часу займацца дастаўкай сьвежай гародніны і таму ён ня можа мяняць мэню сталоўкі.

На складзе ёсьць каля 500 кілё сала, рыбы, калбасы, салоніны, сьвежага мяса, але не хапае ўпартай бальшавіцкай волі і жаданьня стварыць належныя ўмовы для харчаваньня рабочых тарпянікаў.

Ларкі тарпкому адчынены не ва ўсіх пасёлках, рабочым і работніцам прыходзіцца бегаць за 5—6 кілёмэтраў за атрыманьнем продуктаў.

Торпрабкооп Асінторпу павінен зараз-жа павярнуцца тварам да аб



Стральба „Шрапнэльлю“

слугоўваньня ўдарнікаў, зьнішчыць абязьлічку, унядрыць поўны гаспадарчы разрахунак, адчыніць ва ўсіх пасёлках ларкі, наблізіць забясьпечаньне рабочых да іх месца жыцьця і працы.

Рабочы актыў і грамадзкія організацыі павінны дапамагчы коопэрацыйным організацыям хутчэй перабудаваць сваю працу.

Міх. Плашчынскі Г. Пал

11 раёнаў не атрымалі пуцёўкі кантрольнага

Бюро ЦК і пленум ЦК ЛКСМБ вынесьлі пастанову аб скончаньні да 25-га ліпеня мобілізацыі першай тысячы комсамольцаў на торпзаводы і дадатковай мобілізацыі новай тысячы.

Ня гледзячы на тое, што былі ўсталяваны жорсткі тэрмін для выкананьня пастановы і прапанавана ўсім організацыям штодзённа інформаваць ЦК і „Чырвоную Зьмену“ аб ходзе мобілізацыі, ніводзін райком да сёньняшняга дня не даслаў зьвестак аб ходзе гэтай работы.

Гэта сьведчыць аб тым, што важнейшая пастанова пленуму ЦК ЛКСМБ ня выканана.

На торпзавод „Шлях соцыялізму“ Гомельскага раёну павінна быць мобілізавана 160 чалавек (з разьвёрсткі другой тысячы). Аднак, зьявілася на завод толькі 8 мобілізаваных комсамольцаў.

Гомельскі, Кармянскі, Хойніцкі, Ельскі, Мозырскі, Буда-Кашалёўскі, Церахоўскі, Веткаўскі, Рэчыцкі, Лоеўскі і Брагінскі раёны ня выканалі дадзеныя ім разьвёрсткі, у вызначаны тэрмін не паслалі комсамольцаў на торпзавод „Шлях соцыялізму“.

ВЫШЭЙ ЗДАБЫЧЫ ТЭМП!



На здымку: лепшая ўдарная брыгада т. Аўдашкіна на Асінторпе.

28 ліпеня дало павышэньне торпаздабычы ў параўнаньні з мінулым днём. Усяго здабыта за гэты дзень 4519,6 тон торпу, што складае 55,1 проц. сут. заданьня. Такім чынам сэзонны плян выкапаны ўсяго на 31,6 проц., альбо 221718,2 тон торпу, што складае 39,1 проц. каляндарнага пляну.

Барацьба выкоўвае байцоў

Комсамол братэрскіх сэкцый КІМ'у ў змаганьні з антысавецкімі замысламі імпэрыялістых

Польскі фашызм ажыцьцяўляе вайсковыя пляны

Рэпрэсіі супроць комсамольцаў і рэволюцыйнай моладзі

Крызіс больш за ўсё асуджае на голад моладзь

(Ліст атрыманы на мове эспэранто)

У Польшчы, якая зьяўляецца найбольш слабым зьвяном капіталістычнай сыстэмы, крызіс прымае вялізарныя памеры. Паводле апошніх статыстычных зьвестках, тэкстыльная прамысловасьць зьменшыла сваю продукцыйнасьць на 40 проц., будаўнічая прамысловасьць—33 проц., маталя-машынная вытворчасьць—на 23 проц. і г. д. Добра працуюць хэмічная прамысловасьць і мэталёвая, якія рыхтуюць зброю для вайны.

Беспрацоўе ў Польшчы прымае нячуваныя памеры. З фабрык і заводаў кожны дзень на вуліцу выкідаюцца новыя сотні беспрацоўных. Выкідаючы рабочых на вуліцу, капіталізм пажымае на тых, хто застаецца на працы. Умовы аплаты пагаршаюцца, плата за працу зьмяншаецца. На фабрыках уводзяцца больш суровыя штрафы і гэта ўсё для таго, каб з рабочага выжаць усё, што магчыма. На фабрыках і заводах Сілезіі, Лодзі, Заглембы і інш. працуюць не па 8-10, а па 16—18 гадзін у суткі.

Тэкстыльная прамысловасьць Польшчы ніяк не знаходзіць выхаду з крызісу, яе падтрымоўваюць толькі пакуль-што вайсковыя заказы.

Моладзь у першую чаргу выкідаецца з заводаў, асабліва тыя, хто ня мае спэцыяльнасьці і хто паказаў сябе „ненадзейным, падазроным“.

У той час, калі дарослы рабочы атрымлівае ў тыдзень 30—40 злотых (каля 7 р.)—малады рабочы каля 3,5 руб. Зарплату часта плоцяць не грашыма, а бонамі. Жыцьцё моладзі дрэннае. Юнак ня ў сілах у існуючых умовах пракарміць сябе; доўгі час як адзежы ніхто не купляе, а зразумела чаму—няма за што.

Комсамол Польшчы працуе ў падпольлі, але ён мае вялікі ўплыў на моладзь. Турмы не ўбіваюць дух у комсамольцаў, а наадварот, яны больш загартоўваюць моладзь да новых рашаючых рэволюцыйных боек.

Я. М-ц.

Фашызм рыхтуе гарматнае мяса

(Ліст з Польшчы, на мове эспэранто)

У цяжкіх умовах прыходзіцца працаваць польскай моладзі і рэволюцыйнаму студэнцтву. Унівэрсытэты падобны да лягераў, дзе ідзе тэрміновая падрыхтоўка вайсковых кадраў. Вучэбныя програмы перагружаны вайсковымі дысцыплінамі. Утвораны цэлы рад „добраахвотных“ вайсковых аб'яднаньняў, якія працуюць пад наглядам польскіх фашыстых. На асобным вучоце лічацца тыя студэнты, якія не жадаюць запісвацца ў гэтыя „чорныя сотні“. Арышты ідуць галоўным чынам сярод гэтага рэволюцыйнага студэнцтва. Нядаўна ў Львове быў выпадак, калі студэнтам, якія адмовіліся запісацца ў вайсковыя атрады, прапанавалі пакінуць вечар, організаваны ў гонар Пілсудзкага. Шмат студэнтаў далучылася да выходзячых і са сьвістам вышлі з залі. Выходзячыя крычалі: „Прэч дыктатуру Пілсудзкага!“

Выкліканая паліцыя некаторых заарыштавала.

У Кракаве таксама прайшла хваля арыштаў. 24 студэнты Кракаўскага унівэрсытэту абвінавачваюцца ў тым, што „яны займаліся комуністычнай агітацыяй“.

Ня гледзячы на гэта, мы гатовы змагацца за сусьветны Кастрычнік.

Ро-Ле-Попфаль.

Эксплёатацыя моладзі ў Вэнгрыі

У той час, калі лік беспрацоўных павялічваецца—лік моладзі і асабліва дзяцей у прамысловасьці таксама павялічваецца.

Маладняк працуе па 12-14 гадзін у суткі, часам і больш. Каб юрыдычна апраўдаць сваю эксплёатацыю моладзі, гаспадары заводаў і фабрык у кніжках страхавой касы і контрактах пішуць узрост на 4-5 год больш. Гэта дае ім магчымасьць эксплёатаваць моладзь, як толькі магчыма.

Р. Рот.

Ліст з Гамбургу

„Мы не дапусьцім крывавага паходу супроць СССР“

Да рабочых, колгасьнікаў, комсамольцаў і працоўнай моладзі СССР

У Міжнародны Чырвоны дзень пролетарыі Гамбург—Альтаны пасылаюць вам свае братэрскія баявыя прывітаньні і запэўніваюць вас, што мы гатовы кожную хвіліну стаць на абарону Савецкага Саюзу—не дапусьціць крывавага паходу супроць СССР.

Мы ведаем, што абараняючы Савецкі Саюз мы ўзмацняем моц аплоту сусьветнай пролетарскай рэволюцыі, умацняем фонд сусьветнага Кастрычніка. Ад вашых посьпехаў залежыць непасрэдны посьпех нашай барацьбы. Моладзь Савецкага Саюзу ідзе і,— мы ўпэўнены вадалей, будзе ісьці ў першых радох барацьбітоў і будаўнікоў соцыялізму. Вялізарная будоўля, што ідзе зараз у Савецкім Саюзе, адчыняе сотням замежных рабочых вочы на Савецкі Саюз. Яны ўпэўніваюцца і бачаць на што здольна рабочая кляса, калі ўлада у яе руках.

Капіталістычны і соцыял-фашысцкі друк бязупынна вядзе шалёнае цкаваньне Савецкага Саюзу, вылівае цэбры бруднай хлусьні на СССР. У апошнія часы фашысцкі друк напоўнены новай хлусьнёй аб прамове тав. Сталіна! „Сталін у сваёй прамове адмаўляецца ад соцыялізму і ўсхваляе капіталістычны шлях“— Гэтак льюць хлусьню старажытныя псы буржуазіі — не друк.


А восьць сапраўдная, поўнага тэксту прамовы Сталіна ніводная



Калона дэманстрантаў у Бэрліне

буржуазная газета не дае. Зьмішчаюцца зьмененыя абрыўкі з прамовы.

Рабочыя Савецкага Саюзу, комсамольцы і ўся працоўная моладзь— павінны ведаць, які абавязак яны маюць перад пролетарыятам капіталістычных краін. Капіталістыя радуюцца кожнаму прарыву на вашых фабрыках і заводах, кожнай перашкодзе ў выкананьні вялізарных



Рэволюцыйная дэманстрацыя моладзі ў Саксоніі (Нямеччына)

плянаў пяцігодкі.

Буржуазія ахаманкава рыхтуецца да вайны з вамі, бо ведае, што выкананьне вашых плянаў усё больш губіць іх надзею аб „гібелі Саветаў“.

У вайне яны чакаюць знайсьці выхад для трапіўшай у тупік капіталістычнай сыстэмы але мы пад кіраўніцтвам компартыі будуем соцыялізм, мы, пад кіраўніцтвам КПГ руйнуем антысавецкі фронт.

Вашы задачы—паказаць замежным пролетарам, што ня гледзячы на ўсе перашкоды—пяцігодка будзе выканана ў чатыры гады гэроічным уздымам мас.

Памятайце і аб тым, што аб вашых посьпехах павінны ведаць рабочыя і працоўныя замежжамі. Узмацнейце інтэрнацыянальную сувязь.

Няхай жыве пераможная пабудова соцыялізму ў СССР—супроць імпэрыялістычных войнаў—

Рот фронт!

На абарону Савецкага Саюзу—
Рот фронт!

За сусьветны Саюз Савецкіх рэспублік — Рот фронт!

На даручэньню рабочых організацый Р. Е. К.

Гамбург—Альтана

У Францыі ўводзіцца „мусалінаўскі мэтад“ катаваньня

(Ліст комсамольца на мове Эспэранто)

Сёньня год з таго часу, як нас пасадзілі ў камэры буржуазнай турмы. Роўна год назад мы праводзілі ў нашым раёне мощную дэмонстрацыю протэсту супроць вайны. За гэта ўвесь комсамольскі актыў Паўночна-Французкага р-ну па сёньняшні дзень сядзіць у турмах Францыі.

Афіцыйна нас абвінавацілі ў тым, што мы падстракалі салдат на выконвальць загады сваіх начальнікаў. Пасьля 1-га жніўня пачаліся вобыскі, праследаваньні, арышты. Агенты буржуазіі прысуджалі нас да 9 месяцаў зьняволеньня і штрафу 2300 франкаў. Гэты штраф магчыма замяніць 4 месяцамі турмы. Плаціць нам няма чым і мы вось 12 месяцаў сядзім у турме.

Францыя фашызуецца, у турмах пачынае ўжывацца ўсё больш „мусалінаўскі мэтад“ катаваньняў. У турмах Нансі, Санта (Парыж), ужо чутны стогны рабочых і моладзі ад рукі буржуазных катаў.

У дзень 1-га жніўня, мы будзем яшчэ за кратамі, але будзьце ўпэўнены, што, калі мы выйдзем, мы ізноў станем у рады барацьбітоў за сусьветную рэволюцыю.

Жорж Дэлькруя.

Конгрэс інтэрвэнцыяністых

М. ПУЗІКАЎ

Зараз у Вене адбываецца конгрэс II інтэрнацыяналу. Ён сабраўся ва мовах нябывалай яшчэ ў гісторыі для буржуазіі і яе лёкаяў—соцыял-дэмократаў, абстаноўкі. Сучасны сусьветны экономічны крызіс, які разьвіваецца на базе ўсеагульнага пасьляваеннага крызісу капіталізму, да крайнасьці абвастрае ўсе супярэчнасьці капіталізму, з вялікай сілай патрасае усе асновы капіталістычнай сыстэмы, а разам з гэтым падрывае соцыяльную базу II Інтэрнацыяналу. Распаўсюджаныя даволі значна яшчэ ў пэрыод „сухотнага румянцу“ часовай „стабілізацыі“ капіталізму соцыял-дэмократычныя тэорыі аб „організаваным капіталізьме“, якія адхілялі насьпяваньне новага крызісу, прапаведвалі эволюцыйны шлях перарастаньня капіталізму ў соцыялізм, нацярпелі банкруцтва. Поўнасьцю падцьвердзіліся жыцьцёвымі фактамі ўстаноўкі комуністычнай партыі, ўстаноўкі III Комуністычнага Інтэрнацыяналу.

Як вынік разьвіцьця і паглыбленьня экономічнага крызісу, мы маем каля 40-мільённую армію асуджаных на голад ва ўсім капіталістычным сьвеце беспрацоўных, разбурэньне мільённых мас эксплёатуемага сялянства, нявыноснае рабаваньне і нацыянальны ўціск імпэрыялізмам колёніяльных і паўколёніяльных народаў.

Буржуазія шукае выхаду з крызісу ва ўзмацненьні наступленьня на рабочую клясу і эксплёатуемыя масы працоўных, узмацняе вайсковую падрыхтоўку супроць СССР таму, што само існаваньне яго на шостай частцы зямной паверхні азначае існаваньне крызісу капіталізму. Пролетарыят капіталістычных краін і працоўнае сялянства пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі організуе контрнаступленьне супроць капіталу. Разьвіваецца рэволюцыйны крызіс у Кітаі, нарастаюць прадпасылкі рэволюцыйнага крызісу ў Нямеччыне, Польшчы, ўздымаецца рэволюцыйны рух у колёніях.

Пролетарыят, колгасьнікі і ўсе працоўныя СССР пасьпяхова будуюць соцыялізм. Ужо ў гэтым годзе завяршаюць пабудову фундаманту соцыялістычнай экономікі і тым самым узмацняюць Савецкі Саюз, як ударную брыгаду сусьветнага пролетарыяту.

Гэта нябвяржымыя факты. Няхай паспрабуюць абвяргаць іх зараз паны соцыял-дэмократы. Абвяргаць іх, гэта значыць канчаткова абанкруціцца і страціць годнасьць далейшага выкананьня ролі лёкаяў буржуазіі. Тым больш, што і буржуазія прымушана зараз прызнаць наяўнасьць крызісу капіталістычнай сыстэмы і вялізарнейшыя посьпехі савецкай пяцігодкі.

Значыць адвяргаць крызіс капіталістычнай сыстэмы і посьпехі соцыялізму ў СССР—нельга. Трэба шукаць другога шляху, каб служыць буржуазіі і стрымліваць рэволюцыянізаваньне рабочых мас. Трэба ліцамерыць, двурушнічаць, манэўраваць больш, чым дагэтуль. Асаблівую ролю ў гэтым грае „левае“ крыло і „левыя“ правадыры соцыял-дэмократыі. Яны прызнаюць існуючы крызіс капіталістычнай сыстэмы, прызнаюць нават яго „апошнім крызісам“, але-ж яны не робяць вывазу аб неабходнасьці рэволюцыйнага выхаду з крызісу шляхам захопу ўлады пролетарыятам. За тое, яны робяць вывад аб неабходнасьці „лячыць“ капіталізм. Самі становяцца ў ролі лекараў, а адсюль— яўнае падтрыманьне капіталістычнага ладу.

Нарэшце, яны за прызнаньне посьпехаў соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР, але—тут-жа заяўляюць, што „вопыт бальшавікоў ня можа быць паўтораны ў іншых краінах“. Ёсьць і такія, што адмаўляюць соцыялістычны характар Савецкага Саюзу, імкнуцца гэтым затармозіць рост сымпатый рабочае клясы і ўсіх працоўных замежных краін да СССР і рыхтуюць глебу да анты-савецкай інтэрвэнцыі.

Сваю позыцыю яны абгрунтоўваюць тэорыяй „меншага зла“. Падтрымліваць урад Брунінга ў Нямеччыне, праводзіць політыку голаду для працоўных, набіваць новыя кайданы рабочай клясе, растрэльваць рукамі соцыял-дэмократычных поліц-прэзыдэнтаў і паліцыі на вуліцах рабочыя дэмонстрацыі,—соцыял-дэмократы лічуць „меншым злом“, чым пролетарскую рэволюцыю ў Нямеччыне, захоп улады пролетарыятам.

Падтрыманьне фашысцкай дыктатуры, соцыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня мільённых мас Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, жорсткія крывавыя расправы з рэволюцыйным рухам зьяўляюцца „меншым злом“ для ППС, чым пролетарская рэволюцыя ў Польшчы.

Нарэшце, падтрыманьне анты-савецкіх плянаў імпэрыялізму, падрыхтоўка ім вайны, галоўным чынам, супроць СССР, як магутнага рэволюцыянізуючага фактару, зьяўляецца „меншым злом“, чым перамога пролетарскай рэволюцыі ва ўсім сьвеце.

Такая сутнасьць соцыял-дэмократычных тэорый „меншага зла“.

Хаця лідэры II Інтэрнацыянал Вандэрвэльдэ, Абрамовіч і іншыя з вялізарнейшым стараньнем „адхрышчваліся“ ад удзелу ўсяго II інтэрнацыяналу ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР, які быў выкрыты перад усім сьветам у час процэсу „русского бюро“ РСДРП меншавікоў у Маскве, — але-ж інтэрвэнцыяніцкая роля II інтэрнацыяналу ў адносінах да СССР неабвяржыма. А „адхрышчваньне“, як і ўсякае манэўраваньне, двурушніцтва, ліцамер'е соцыял-дэмократам патрэбна для пакрыцьця сваёй варожай пролетарыяту лініі.

Але магчымасьці гэтага манэўраваньня таксама з кожным днём скарачаюцца. Побач з разгортваньнем экономічнага крызісу, процэсам усё большага перарастаньня соцыял-дэмократыі ў фашызм, выкрыцьцём яе здрадніцкай ролі і разгортваньнем рэволюцыйнага руху, расьце бражэньне ў шэрагах соцыял-дэмократычных партый, паскараецца адыход ад іх ашуканых рабочых, звужаюцца іх манэўравальныя магчымасьці. Зараз у наяўнасьці пасьпяваньне крызісу соцыял-дэмократычных партый, яго мы маем у нямецкай і польскай соцыял-дэмократыі. Асабліва крызіс ахоплівае маладзёжныя соцыял-дэмократычныя організацыі.

Таму адбываецца зараз у Вене конгрэс II інтэрнацыяналу, прыдзецца надзвычайна многа аддаць увагі новым манэўраваньням, каб, прыкрываючыся „левымі“ фразамі, апраўдваць сваё лёкайства буржуазіі, удзельнічаць ва ўціску рэволюцыйнага руху, рыхтаваць інтэрвэнцыю супроць СССР, шукаць выхаду з таго становішча, у якім знаходзяцца с.-д. партыі.

Разам з правядзеньнем міжнароднага чырвонага дня, задача комуністычнай партыі і комсамолу—выкрываць здрадніцкую, контр-рэволюцыйную ролю соцыял-дэмократыі, асабліва яе „левага“ крыла, растлумачваючы шырокім працоўным масам, што толькі комуністычная партыя зьяўляецца адзінай рэволюцыйнай партыяй пролетарыяту, якая моцна трымае сьцяг Леніна і пад гэтым сьцягам вядзе рабочую клясу і працоўныя сялянскія масы да канчатковай перамогі комунізму ва ўсім сьвеце.

Гаспадарчы разрахунак у брыгадзе
Бальшавікі мандат на перамогу

Зараз ужо даведзена, што па-бальшавіцку ажыцьцяўлены гаспадарчы разрахунак—адзін з асноўных стымулаў для забясьпечаньня выкананьня прамфінпляну, правільнай расстаноўкі сіл, поўнага скарыстаньня ўсіх магчымасьцяй перамогі.

Друкуемыя сёньня матар'ялы аб ажыцьцяўленьні гаспадарчага разрахунку на чырвонаштандарным „Бальшавіку“ і стане працы Віцебскай фабрыкі „Шлях індустрыялізацыі“ яшчэ раз гэтае даводзяць.

Комсамольская організацыя „Бальшавіку“ павінна змагацца за рашучае зьнішчэньне маючыхся недахопаў у практыцы ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку за даводзеньне яго да брыгады. Комсамольская ячэйка фабрыкі „Шлях індустрыялізацыі“ павінна скарыстаць вопыт ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку і стаць конкрэтным практычным выканаўцам ідэі гаспадарчага разрахунку ў цэху, брыгадзе.

Гэтая задача паўстала перад кожнай комсамольскай ячэйкай, і патрабуе самага хуткага неадкладнага выкананьня.

Гаспадарчы разрахунак у брыгаду

З упэўненасьцю мы можам сказаць, што гаспадарчы разрахунак зьявіўся адным з галоўных стымулаў, які даў магчымасьць чырвонаштандарнаму „Бальшавіку“ з кварталу ў квартал перавыконваць прамфінплян.

Раней было: майстар цэху не адчуваў амаль ніякай адказнасьці за становішча цэху. Для вырашэньня дробязі прыходзілася бегчы да дырэктара. Нярэдка па гэтых дробязных пытаньнях у дырэкцыі ў час працы зьбіралася ўся цэхавая адміністрацыя. Перавыдаткі матар'ялу, непатрэбная страта электраэнэргіі і вады была звычайным зьявішчам, з якім было надзвычайна цяжка змагацца.

Карэннае зьмяненьне гэтага становішча было дасягнута ўвядзеньнем гаспадарчага разрахунку. Гаспадарча-разрахунковы дагавар, заключаны загадчыкам цэху, зьвязаў асноўнай рашучай перабудовы працы цэхадміністрацыі, а значыцца і ўсяго цэху. Было дасягнута найбольш рацыянальнае скарыстаньне рабочых, значна ўшчыльнены рабочы дзень, паменшыліся прастоі і выдаткаваньні матар'ялаў.

Зараз ужо можна падвесьці некаторыя вынікі і зазначыць недахопы ў правядзеньні гаспадарчага разрахунку ў цэхах заводу „Бальшавік“.

Асноўнае тое, што рабочыя масы заводу надзвычайна слаба ўцягнуты ў ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку, не азнаёмлены з асноўнымі прынцыпамі ажыцьцяўленьня гэтага мерапрыемства.

У шмат якіх цэхах ударнікі ня ведаюць аб тым, што аддзяленьне працуе на гаспадарчым разрахунку.

Не пазьбеглі і пакатовых скажэньняў гаспадарчага разрахунку з боку цэхадміністрацыі. Так, напрыклад, у 2-м хромавым цэху майстар цэху т. Дрэйслер не прытрымліваўся тэхнічных правіл, занадта эканоміў хэмічныя матар'ялы, з-за чаго на працягу 10 дзён з цэху выходзіла прадукцыя дрэннай якасьці.

У цэхах яшчэ дагэтуль не ўстаноўлены вымяральнікі скарыстаньня электра-энэргіі.

Адным з асноўных недахопаў ажыцьцяўленьня гаспадарчага разрахунку на „Бальшавіку“ зьяўляецца тое, што дагэтуль гаспадарчы разрахунак не дадзены на брыгады. Заводкіраўніцтва надзвычайна марудна са значай бальшавасьцю праводзіць працу па пераводу брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Наступны крок усіх арганізацый заводу „Бальшавік“ — мобілізацыя ўсіх мас рабочых заводу на ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку і канчатковы пераход усіх брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Гэта яшчэ больш замацуе дасягнутыя посьпехі, гэта зробіць цэхі чырвонаштандарнага „Бальшавіка“ прыкладам перамогі.

З. Мінкін

Цэхі тонуць у безадказнасьці

Гаспадарчы разрахунак яшчэ ня стаў сыстэмай працы на Віцебскай кравецкай фабрыцы „Сьцяг індустрыялізацыі“- Безгаспадарчасьць, безадказнасьць цэхавой адміністрацыі, адсутнасьць мобілізацыі ўнутраных рэсурсаў—асноўныя моманты якія перашкаджаюць выкананьню прамфінпляну і якія павінны быць зьнішчаны ўвядзеньнем гаспадарчага разрахунку.

Агульнае становішча фабрыкі высоўвае неабходнасьць самага тэрміновага пераводу на гаспадарчы разрахунак. У бручным цэху знойдзена шмат сапсаваных брук, поўфабрыкатаў. Пачка брук надзвычайна каштоўнага штучнага матар'ялу валяецца пад сталом у напалову спытым выглядзе. Ува ўсіх скрынках і на сталах раскіданы незакончаныя брукі і інш.

Вялікая колькасьць продукцыі нясконччана з-за адсутнасьці дробных дэталяў, што тлумачыцца незацікаўленнасьцю інструктароў і цэхадміністрацыі.

У піджачным цэху ня лепш. У істужцы № 2 у памяшканьні цэхкому ляжыць кіпа няскончаных піджакоў ужо пяць месяцаў. У закройным цэху ляжыць пяць мяшкоў бракаванага раскрою, які ня можа быць скарыстаны на фабрыцы і не перададзены іншым організацыям.

У закройным цэху няма адказных за брак. Брак фіксуецца, а конкрэтны вінавайца ня прыцягваецца да адказнасьці.

Толькі па-бальшавіцку ажыцьцяўлены гаспадарчы разрахунак можа вывесьці цэхі з паласы безадказнай нядбайнай працы.

Ня гледзячы на ўсю відавочнасьць гэтага, партыйныя, комсамольскія і профсаюзныя організацыі фабрыкі ня прымаюць ніякіх дзейных захадаў да ўвядзеньня гаспадарчага разрахунку.

Д. У—ін.

ЯШЧЭ НЯМА БАЯВЫХ ТЭМПАЎ
Ударнай работай на фронце культбудаўніцтва змагацца за ганаровы сьцяг ЦК КП(б)Б

Толькі месяц застаўся да пачатку новага навучальнага году. Але ня гледзячы на гэта, як адзначана ў зьмяшчаемай намі сёньня пастановы ЦК КП(б)Б, „падрыхтоўка да новага навучальнага году праходзіць нездавальняючымі тэмпамі“.

Усе організацыі, ад Наркамасьветы да фабзаўмясцкомаў, не разгарнулі ўдарнае работы па падрыхтоўцы да навучальнага. Нават двухдэкаднік трывогі, абвешчаны НКА, ЦК ЛКСМБ і ЦП Працасьветы з-за вярблюжжых тэмпаў работы саміх організатараў і бязьдзейнасьці друку ня даў зруху ў справе падрыхтоўкі да новага навучальнага.

Дырэктыва ЦК ЛКСМБ колектывам друкарні імя Сталіна, Добрускай папяровай фабрыцы і ячэйкам БДВ БКС і Белдзяржснабу аб організацыі пастоў для таго, каб сачыць за ходам работы па забясьпячэньню школ падручнікамі, програмамі, вопраткай і г. д., ня выканана. Ні ў воднай ячэйцы пост не організован, ніводнай інформацыі, ні „Чырвоная Зьмена“, ні ЦК ЛКСМБ не атрымалі.

Далей такое становішча нецярпіма. Пастанова ЦК КП(б)Б па дакладу НКА аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году яскрава падкрэслівае: „Профсаюзным, партыйным і комсамольскім організацыям і органам НКА ўзмацніць работу па правядзеньню культпаходу, асноўнай мэтай якога паставіць мобілізацыю шырокіх мас працоўных для падрыхтоўкі да новага навучальнага году“.

Гэта значыць, што далей працаваць такімі тэмпамі, як працавалі раней, нельга. Рабоце па падрыхтоўцы да новага навучальнага году неабходна надаць бальшавіцкія тэмпы. Кароткі тэрмін, які застаўся, трэба максымум скарыстаць для сваячасовага і пасьпяховага пачатку навучальнага.

Комсамол, як шэф усеабучу павінен, кіруючыся пастановаю ЦК КП(б)Б, забясьпечыць у сваім раёне школы ўсім неабходным, каб яны (школы) сваячасова распачалі работу.

Пастанова ЦК КП(б)Б
па дакладу НКА аб падрыхтоўцы да новага навучальнага году

ЦК КП(б)Б адзначае, што ў выніку рашучага правядзеньня ленінскай нац. політыкі і посьпехаў соц. будаўніцтва, за мінулы навучальны год ёсьць значнае прасоўваньне наперад на рашаючых вучастках культурнага будаўніцтва. З посьпехам праведзена ўсеагульнае абавязковае навучаньне, выканан у асноўным плян ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці, выканан плян падрыхтоўкі кадраў для культфронту, значна пашыран масавы рух рабочых і працоўных мас за культуру, тэхніку і новыя соцыялістычныя формы працы, зроблены некаторыя крокі да ўвязкі культурнага будаўніцтва з задачамі гаспадарчага і соцыялістычнага будаўніцтва.

Ня гледзячы на гэта, тэмпы культурнага будаўніцтва ўсё яшчэ адстаюць ад шпаркіх тэмпаў соцыялістычнага будаўніцтва і культурных запатрабаваньняў найшырэйшых працоўных мас. Посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва і адзначаныя вышэй дасягненьні ў галіне культ. будаўніцтва ствараюць базу для новага культурнага ўздыму БССР і значнага паскарэньня тэмпаў культурнага будаўніцтва.

ЦК лічыць, што асноўнымі задачамі культ. будаўніцтва ў 1931-32 годзе зьяўляюцца:

а) Пераўтварэньне БССР да 1-га мая 1932 г. у краіну суцэльнай пісьменнасьці, ліквідаваўшы рэшткі няпісьменнасьці сярод рабочых і дапрызыўнікаў да 1-га кастрычніка 1931 г.

б) Поўнае выкананьне пляну абавязковага навучаньня і ахоп школай усіх дзяцей ад 8 да 11 год, школамі-курсамі ўсіх няпісьменных і малапісьменных падросткаў 12-15 год; увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе сямігодкі для ўсіх дзяцей у гарадах, прамысловых цэнтрах, фабрычна заводзкіх пасёлках і рабочых раёнах.

в) Узмацненьне тэмпаў разгортваньня сеткі ШКМ і ФЗС у адпаведнасьці з сеткай тэхнікумаў і ФЗВ на ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Разгортваньне сыстэмы курсаў, рабфакаў, завочнага навучаньня з тым, каб забясьпечыць прыём ФЗВ, тэхнікумы і ВНУ па ўсіх галінах народнае гаспадаркі і культуры.

г) Барацьба за павышэньне якасьці ўсёй работы масавых школ, і ўпрыватнасьці перабудова іх на асновах політэхнізацыі з прыстасаваньнем да эканомічнага профілю кожнага раёну.

Разгортваньне дашкольных устаноў з разьлікам ахопу імі ўсіх дзяцей работніц і колгасьніц.

д) Далейшы рашучы паварот усёй культасьветнай работы да выкананьня прамфінпляну і соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі, да барацьбы за генэральную лінію партыі, супроць правага і „левага“ опортунізму, супроць вялікадзяржаўнага шовінізму, нац.-дэмократызму, за ажыцьцяўленьне ленінскай нац. політыкі.

е) Першачарговае абслугоўваньне культпрацай прамысловасьці асабліва новабудоўляў і ў прыватнасьці організацыі мэтодычнага кіраўніцтва ўсімі формамі работы па аўладаньню тэхнікай.

Выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове разгортваньня шырокай падрыхтоўчай работы да новага навучальнага году і вядзеньня гэтай работы, як баявой політычнай кампаніі.

Між тым мясцовыя, партыйныя савецкія, профэсыянальныя і комсамольскія організацыі недаацанілі значэньня гэтай работы. Падрыхтоўка да новага навучальнага году праходзіць яўна нездавальняючымі тэмпамі. Органы нарасьветы яшчэ не ператварыліся ў сапраўдны штаб культурнай рэволюцыі, тэмпы работы па організацыі культпаходу нездавальняючыя, адсутнічае адзіны плян культурнага будаўніцтва, рад устаноў, у прыватнасьці Белкоопсаюз, Белдзяржснаб, Белколгасцэнтр ня выканалі дырэктыў партыі і ўраду па пытаньнях падрыхтоўкі да новага навучальнага году (у прыватнасьці па забясьпечаньні вопраткай, абуткам і г. д.).

У асабліва нездавальняючым становішчы знаходзіцца школьнае будаўніцтва, вакол якога не мобілізаваны сродкі, сілы і ўвага грамадзкасьці.

Выходзячы з гэтага, ЦК пастанаўляе

1. Профсаюзным партыйным і комсамольскім організацыям і органам НКА ўзмацніць работу па правядзеньні культ паходу, асноўнай мэтай якога паставіць мобілізацыю шырокіх мас працоўных для падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

2. РК КП(б)Б неадкладна рэалізаваць пастанову ЦК аб організацыі саветаў культурнага будаўніцтва пры РВК і сельсаветах, паставіўшы перад імі ў якасьці асноўнай задачы стварэньне і правядзеньне ў жыцьцё адзінага пляну культ. будаўніцтва ўсіх грамадзкіх організацый і дзяржаўных устаноў, якія вядуць культработу.

Ажывіць работу камітэту ўсеагульнага навучаньня пры СНК БССР.

3. Разгарнуць паміж гарадамі і раёнамі соцспаборніцтва па культурным будаўніцтве. Вызначыць у якасьці прызу для гораду ці раёну, які першым дасягне ўсеагульнай пісьменнасьці і лепшых паказальнікаў па культ. будаўніцтве, ганаровы сьцяг ЦК КП(б)Б.

4. РК КП(б)Б і НКА мобілізаваць усе ўнутраныя рэсурсы, а таксама ўвагу і сродкі грамадзкасьці вакол школьнага будаўніцтва. Прыраўняць школьнае будаўніцтва да першачарговага.

Даручыць СНК прыняць тэрміновыя меры для забесьпячэньня новага набору інтэрнатамі праз паскарэньне будаўніцтва агульных памяшканьняў барачнага тыпу.

5. Прапанаваць БДВ, Цэнтравыдавецтву і Белкоопсаюзу забясьпечыць выпуск падручнікаў і програм і давесьці іх у школы да 1-га верасьня 1931 г. Камітэту па справах друку і Поліграфаб'яднаньню наладзіць бесьперабойнае забесьпячэньне выдавецтва неабходнай паперай для выданьня падручнікаў.

6. Скончыць да 1-га кастрычніка прымацаваньне школ да прадпрыемстваў, колгасаў, саўгасаў і МТС, організаваць грамадзкую праверку ўжо заключаных дагавароў. Рэорганізаваць рад ФЗС і ШКМ у дасьледчыя школы па пытаньнях політэхнізацыі. ЦСПСБ разам з НКА правесьці ў прамысловых цэнтрах шырокія рабочыя конфэрэнцыі па політэхнізьме.

7. Даручыць НКА разам з ЦП саюзу працасьветы на працягу 1931-32 году ахапіць усіх настаўнікаў, якія ня маюць вышэйшай асьветы, вячэрнім завочным навучаньнем. Для кіраўніцтва гэтай работай і павышэньня кваліфікацыі кадраў нарасьветы з пачатку 1932 г. адкрыць дзяржаўны інстытут. Адкрыць у кожным раёне апорную школу, ператварыўшы яе ў цэнтр мэтодычнай дапамогі настаўніцтву.

8. РК КП(б)Б забясьпечыць неабходную колькасьць і якасьць набору ў пэд. навуч. установы, ЦК ЛКСМБ мобілізаваць у пэд. ВНУ і пэдтэхнікумы ня менш 1.000 асоб.

9. Даручыць камісіі выкананьня неадкладна праверыць выкананьне гаспадарчымі організацыямі дырэктыў партыі і ўраду аб падрыхтоўцы да навучальнага году, забесьпячэньне абуткам, вопраткай, політэхнічнымі прыладамі, сьнеданьнямі і г. д. У прыватнасьці зьвярнуць увагу на выкананьне дырэктыў аб паляпшэньні матар'яльна-правага становішча настаўніцтва.

10. СНК прадугледзець у народнагаспадарчым пляне на 1932 г. павялічэньня кантынгенту культасьветных устаноў і грашовых асыгнаваньняў, якія будуць забясьпечваць выкананьне пастаўленых задач у культурным будаўніцтве.

11. Адзначаючы слабое асьвятленьне ў друку работы па культ. будаўніцтве і ў прыватнасьці падрыхтоўкі да новага навучальнага году, прапанаваць цэнтральным і мясцовым газэтам больш шырока і паглыблена асьвятляць культбудаўніцтва ў БССР.

ЦК КП(б)Б падкрэслівае, што выкананьне задач культурнага будаўніцтва зьяўляецца абавязковай умовай агульнага наступленьня соцыялізму і завяршэньня пабудовы фундаманту соцыялістычнай экономікі, што выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове пастаноўкі іх, як баявых політычных задач пры актыўным удзеле ўсёй КП(б)Б, комсамольскіх організацый, усіх асьветнікаў і найшырэйшай пролетарскай грамадзкасьці.

Праверце, ці падрыхтавана школа для іх сустрэчы?

Праз месяц яны павінны заняць месцы за партай.

Фронт усеабучу прарваны
Комсамолія, ліквідуй прарыў!

Жлобінскі раён яшчэ не пачаў падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Дзеці, падлягаючыя ўсеагульнаму навучаньню ахоплены школамі на 90 процантаў. 206 чалавек 8—11-гадовага ўзросту і 171 чалавек 11—15 гадоў знаходзяцца па-за школамі.

У раёне 145 няпісьменных ад 18-гадовага ўзросту да 45 год. З гэтага ліку 22 прызыўнікі 1909 г. нараджэньня.

Распачата будаўніцтва 8-мі першапачатковых школ і 1 сямігодкі. Неабходна да пачатку навучальнага года будаўніцтва скончыць.

Партыйна-комсамольскія організацыі і раённы аддзел нарасьветы нічога не зрабілі для таго, каб ахапіць усіх дзяцей школамі, ліквідаваць няпісьменнасьць сярод насельніцтва, асабліва сярод прызыўнікаў.

Жлобінскі РК ЛКСМБ з-за нядбайных адносін да разгортваньня падрыхтоўкі навучальнага году ставіць пад сумненьне сваю здольнасьць ажыцьцяўляць шэфства над усеабучам.

Р. М.

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Галоўлітбел № 599